УДК 391:069.51(476.1)

# РЭПРЭЗЕНТАЦЫЯ ТРАДЫЦЫЙНАГА БЕЛАРУСКАГА КАСЦЮМА МУЗЕЯМІ МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ

***К. А. Скур'ят,***
*саіскальнік вучонай ступені кандыдата навук установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», навуковы супрацоўнік Дзяржаўнай установы «Мінскі абласны краязнаўчы музей»*

**Анатацыя.** У музеях Мінскай вобласці захоўваюцца значныя калекцыі народнага строя. У артыкуле аўтар акцэнтуе ўвагу на папулярызацыі традыцыйнага беларускага касцюма музеямі Мінскай вобласці. Вылучаны найбольш распаўсюджаныя тыпы рэпрэзентацыі традыцыйнага касцюма музеямі Мінскай вобласці – экспазіцыі, часовыя выставы, музейныя заняткі. На прыкладзе трох музеяў Мінскай вобласці прадэманстраваны прыклады рэпрэзентацыі традыцыйнага касцюма мясцовага насельніцтва.

**Ключавыя словы:** традыцыйны касцюм, строй, часовая экспазіцыя, музейны занятак, музейная дзейнасць, Мінская вобласць, музей.

# REPRESENTATION OF THE TRADITIONAL BELARUSIAN COSTUME BY MUSEUMS OF THE MINSK REGION

***K. Skuryat,***
*Competitor of a Scientific Degree of Candidate of Sciences of the Educational Institution «The Belarusian State University of Culture and Arts», Researcher of the State Institution «Minsk Regional Museum of Local History»*

**Abstract.** The museums of the Minsk region have significant collections of folk costume. In the article, the author focuses on the popularization of the traditional Belarusian costume by the museums of the Minsk region. The article describes the most common types of representation of traditional costume by museums of the Minsk region – expositions, temporary exhibitions, museum classes. Using the example of three museums of the Minsk region, the author demonstrates examples of the representation of the traditional costume of the local population.

**Keywords:** traditional costume, costume, temporary exhibition, museum activity, museum activity, Minsk region, museum.

Музеі Беларусі з'яўляюцца цэнтрамі збору, захавання і папулярызацыі этнаграфічнай спадчыны беларускага народа. Музейныя прадметы сістэматызаваны па калекцыях, што спрыяе дакладнай навуковай апрацоўцы прадметаў у фондах і выкарыстанні іх пры правядзенні выставак і стварэнні экспазіцый. Такім чынам, музеі з'яўляюцца цэнтрамі прэзентацыі традыцыйнай беларускай культуры.

Амаль ва ўсіх музеях Мінскай вобласці захоўваюцца калекцыі традыцыйных *народных* строяў. Значныя калекцыі *народнага касцюма* сабраны ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту ў Строчыцах, Музеі беларускага народнага мастацтва ў Раўбічах, Капыльскім краязнаўчым музеі, Слуцкім краязнаўчым музеі, музеях у Старых Дарогах, Заслаўі і г. д.

Сёння ва ўмовах глабалізацыі культуры становяцца ўсё больш актуальнымі тэндэнцыі самаідэнтыфікацыі розных народаў і культур. Адной з праяў гэтага працэсу з'яўляецца адраджэнне традыцый беларускага нацыянальнага касцюма. Існуе дастатковая колькасць навуковай літаратуры па вывучэнню традыцыйных народных строяў Цэнтральнай Беларусі. Асаблівасці народнага касцюма Міншчыны разгледжаны ў працах В. М. Бялявінай, Л. В. Ракавай, М. Ф. Раманюка, Л. І. Маленка і інш. [1; 2; 7].

Этнаграфічная і рэгіянальна-лакальная своеасаблівасць Міншчыны была даследавана ў калектыўнай манаграфіі «Этнокультурные процессы Центральной Беларуси в прошлом и современности», выдадзенай у 2015 г. [10]. У трэццім раздзеле «Матэрыяльная культура Цэнтральнай Беларусі» змешчаны звесткі аб традыцыйным касцюме, галаўных уборах, вышыўке Цэнтральнай Беларусі [Там жа, с. 234–288].

У нашы дні значная колькасць элементаў традыцыйнага строя захоўваецца ў музейных калекцыях і выкарыстоўваецца ў навукова-даследчай, экспазіцыйна-выставачнай і музейна-педагагічнай дзейнасці.

Прыкладам выкарыстання традыцыйнага касцюма на пастаянных выставах музеямі Мінскай вобласці можа паслужыць дзейнасць Слуцкага краязнаўчага музея, які валодае вялікай калекцыяй традыцыйнага ткацтва. Асноўная частка калекцыі была сабрана падчас этнаграфічных экспедыцый па тэрыторыі былога Слуцкага павета ў другой палове XX ст.

З мэтай больш поўнага знаёмства з музейнымі прадметамі жыхароў рэгёна ў 2001 г. быў адчынены этнаграфічны філіял музея «Побыт і заняткі сялян Слуцкага павета XIX – пачатку XX стагоддзяў». У 2006 г. філіял быў перайменаваны ў «Музей этнаграфіі» [8]. Колькасць прадметаў у фондах філіяла складае звыш за 1 000 адзінак, з іх каля 200 уключана ў экспазіцыю.

Так, у экспазіцыйнай прасторы размешчаны летні святочны касцюм замужняй жанчыны слуцкага строя, характэрнага для тэрыторыі г. Слуцка і навакольных вёсак (канец XIX – пачатак XX ст.), і

традыцыйны мужчынскі касцюм, які з’яўляецца зборным вобразам адзення беларускага селяніна (канец XIX – пачатак XX ст.) і складаецца з элементаў касцюма, прывезеных у розныя часы з этнаграфічных экспедыцый. Слуцкаму строю ўласціва аднатыпнасць форм адзення, сціплае геаметрычнае арнаментальнае аздабленне, перавага крамных тканін [9]. Жаночы гарнітур складаецца з кашулі, спадніцы, фартуха, гарсэта, чаравікаў. Галаўным уборам служыць намітка белага колеру з геаметрычным арнаментальным аздабленнем. Акрамя намітак для галаўнога убора слуцкага строя былі характэрны вялікія, з махрамі, набіваныя хусткі, завязаныя ў выглядзе цюрбана.

Музей актыўна супрацоўнічае са школамі. Так, па дамове з музеем яго супрацоўнікі праводзяць у школах лекцыі, прысвечаныя розным пытанням традыцыйнага жыцця мясцовага насельніцтва. Адна з іх прысвечана слуцкаму строю. Падчас лекцый слухачам распавядаюць аб гісторыі, адметных рысах, значэнні строя, адрозненнях ад іншых строяў і г. д. У якасці нагляднага матэрыялу выкарыстоўваюцца элементы адзення з фондаў музея.

Яшчэ адной задачай рэпрэзентацыі традыцыйнага касцюма музеямі Мінскай вобласці з’яўляецца стварэнне атмасферы мінулай эпохі. Для гэтых мэт выдатна падыходзяць сучасныя копіі касцюмаў, прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

У гэтых адносінах прыкладам з’яўляюцца экспазіцыі і фонды Мінскага абласнога краязнаўчага музея. З-за недахопу экспазіцыйнай плошчы ў пастаяннай экспазіцыі музея размешчаны лялькі ў касцюмах вілейскага і пухавіцкага народных строяў. Лялькі экспануюцца побач з ткацкімі вырабамі (посцілкамі, рушнікамі, наміткамі) і фотаздымкамі сялян канца XIX – пачатку XX ст. Экспазіцыя дае наведвальніку багатую інфармацыю пра асаблівасці народных строяў Цэнтральнай Беларусі [6].

У нашы дні для музейных заняткаў усё часцей выкарыстоўваюцца сучасныя копіі беларускага традыцыйнага касцюма. Так, у Мінскім абласным краязнаўчым музеі была створана копія святочнага касцюма замужняй жанчыны пачатку XX ст. Узорам для касцюма паслужылі рэчы з калекцыі народнага ткацтва, сабраныя падчас этнаграфічных экспедыцый у Чэрвенскім раёне ў 1960–70-я гг. Навуковы супрацоўнік у народным касцюме праводзіць з навучэнцамі тэатралізаваную экскурсію або музейны занятак этнаграфічнай тэматыкі.

Сярод дзяржаўных музеяў Мінскай вобласці адна з буйнейшых калекцый беларускага касцюма (каля 1600 адзінак) захоўваецца ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту, у ёй прадстаўлены строі амаль з усіх рэгіёнаў Беларусі [4].

Прадметы з калекцый актыўна выкарыстоўваюцца ў выставачнай і музейна-педагагічнай дзейнасці музея. Так, з 21 мая па 31 жніўня 2021 г. у музеі праходзіла часовая выстаўка «Беларускія народныя строі», на якой было прадстаўлена больш за 20 строяў з кожнага

рэгіёна Беларусі. Супрацоўнікі музея, апранутыя ў народныя строі, дэманстравалі рэгіянальныя адрозненні касцюмаў [3].

Навуковымі супрацоўнікамі музея распрацаваны цыкл музейна-педагагічных заняткаў. Адзін з іх для вучняў 7–11 класаў называецца «Традыцыйныя беларускія касцюмы» [5].

Падчас правядзення заняткаў удзельнікам дэманструюць фотаздымкі жаночага і мужчынскага традыцыйных строяў з розных рэгіёнаў Беларусі, у т. л. з Міншчыны, распавядаюць пра незвычайныя назвы элементаў беларускага строя (андарак, саян і г. д.). Напрыканцы музейнага занятку ўдзельнікі танцуюць народныя танцы (Лявоніху, Картузы), гуляюць у традыцыйныя беларускія гульні (Явар, Журавель, Цяцеру).

Такім чынам, традыцыйны касцюм Міншчыны мае багатую гісторыю і традыцыі. Музеямі Мінскай вобласці ў другой палове XX ст. былі сабраны значныя калекцыі народнага строя, якія з'яўляюцца аб'ектам навуковага даследавання, аўтэнтычныя традыцыйныя касцюмы экспануюцца на часовых і пастаянных выстаўках, выкарыстоўваюцца пры правядзенні музейна-педагагічных заняткаў. Для лепшай захаванасці аўтэнтычных касцюмаў музеямі выкарыстоўваюцца зробленыя на іх аснове копіі. Актыўная дзейнасць навуковых супрацоўнікаў музеяў Мінскай вобласці спрыяе патрыятычнаму выхаванню наведвальнікаў, захаванню і абуджэнню цікавасці да традыцыйнага касцюма.

*1.* Беларускае народнае адзенне / [Л. А. Малчанава і інш.] ; рэд. В. К. Бандарчык ; Акад. навук БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Навука і тэхніка, 1975. – 94 с.

*2. Бялявіна, В. М.* Беларускі касцюм / В. М. Бялявіна, Л. В. Ракава. – Мінск : Беларусь, 2017. – 463 с.

*3. Ішчанка, С.* Світка, намітка, вярэнька, андарак... Экспазіцыя «Беларускі народны строй» адкрылася ў нашым вядомым музеі-скансэне [Электронны рэсурс] / С. Ішчанка // Звязда. – 29.05.2021. – Рэжым доступу: https://zviazda.by/ru/node/217526. – Дата доступу: 29.05.2021.

*4.* Коллекции [Электронный ресурс] // Белорусский государственный музей народной архитектуры и быта : офиц. сайт. – Режим доступа: https://ru.etna.by/collections. – Дата доступа: 06.05.2022.

*5.* Музейно-педагогические занятия [Электронный ресурс] // Белорусский государственный музей народной архитектуры и быта : офиц. сайт. – Режим доступа: https://ru.etna.by/services/muzejnye-zanyatiya. – Дата доступа: 08.06.2022.

*6.* Постоянная экспозиция «История Минщины с древнейших времен до начала XX в.» [Электронный ресурс] // Государственное учреждение «Минский областной краеведческий музей». – Режим доступа: http://molodechno-mokm.museum.by/node/46288. – Дата доступа: 06.05.2022.

*7. Раманюк, М. Ф.* Беларускае народнае адзенне : альбом / М. Ф. Раманюк. – Мінск : Беларусь, 1981. – [47] с., [128] л. іл.

*8.* Філія «Музей этнаграфіі» дзяржаўнай установы «Слуцкі краязнаўчы музей» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://ethno.slutsk.museum.by/be. – Дата доступу: 04.04.2020.

*9.* Этнаграфія Беларусі / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1989. – 575 с.

*10.* Этнокультурные процессы Центральной Беларуси в прошлом и настоящем / А. В. Гурко [и др.] ; науч. ред. А. В. Гурко ; Нац. акад. наук Беларуси, Центр исслед. белорус. культуры, яз. и лит., Фил. «Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора им. К. Крапивы». – Минск : Беларус. навука, 2016. – 539 с.